**Дулаў А.М.**

# УКЛАД НІНЫ ІВАНАЎНЫ ДАРАФЕЕНКА Ў ДАСЛЕДАВАННЕ ПОДЗВІГУ ВЕРЫ ЗАХАРАЎНЫ ХАРУЖАЙ У АКУПАВАНЫМ ВІЦЕБСКУ

У сучаснай беларускай гістарыяграфіі адсутнічае грунтоўная навуковая біяграфія Героя Савецкага Саюза Веры Захараўны Харужай, хаця яе неабходнасць наспела ўжо даўно. У той жа час у перыядычным друку і ў сецівe апублікаваны цэлы шэраг артыкулаў, прысвечаных легендарнай удзельніцы вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі і падпольшчыцы перыяду Вялікай Айчыннай вайны. Але многія з іх павярхоўныя, утрымліваюць шматлікія недакладнасці і фактычныя памылкі. Асабліва шмат міфаў існуе ў адносінах падпольнай дзейнасці Веры Захараўны ў Віцебску. Яны прысутнічаюць нават у вучэбных і навукова-папулярных выданнях. Так распаўсюджаны меркаванні, што Вера Харужая альбо прыйшла ў горад разам з групай жанчын-разведчыц, накіраваных з Масквы, і разгарнула падпольную дзейнасць, альбо стварыла і ўзначаліла тут падпольную групу. Гэта тым больш здзіўляе, бо віцебскія старонкі біяграфіі В.З. Харужай былі грунтоўна даследаваны яшчэ ў другой палове XX ст. Нінай Іванаўнай Дарафеенка (1923–2015). Мэта нашай працы – раскрыць уклад Н.І. Дарафеенка ў навуковае вывучэнне подзвігу В.З. Харужай у акупаваным Віцебску.

Ніна Іванаўна Дарафеенка невыпадкова абрала тэму сваіх даследаванняў. У гады Вялікай Айчыннай вайны яна сама была падпольшчыцай і партызанкай брыгады Аляксея. Пасля вайны Ніна Іванаўна стала гісторыкам, шмат гадоў выкладала ў Віцебскім дзяржаўным педагагічным інстытуце імя С.М. Кірава (сёння – Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава), абараніла кандыдацкую дысертацыю “Витебское партийное, патриотическое подполье в годы Великой Отечественной войны (июль 1941 – июнь 1944 г.)” (1968) [8; 9; 10]. Тэма антыфашысцкай барацьбы была блізкай і мужу Ніны Іванаўны – Мікалаю Уладзіміравічу Дарафеенку, які падчас вайны быў лётчыкам-знішчальнікам, а пасля стаў журналістам, працаваў на партыйнай і савецкай рабоце, узначальваў камітэт па радыёвяшчанні і тэлебачанні Віцебскага аблвыканкама, доўгі час з’яўляўся галоўным рэдактарам газеты “Віцебскі рабочы” [14]. Вывучэнне падпольнай барацьбы Ніна Іванаўна і Мікалай Уладзіміравіч успрымалі як асабісты абавязак, маральны доўг перад змагарамі з нацызмам.

Менавіта М.У. Дарафеенка літаратурна апрацаваў тэкст дысертацыі Ніны Іванаўны, што дазволіла выдаць кнігу, якая па сённяшні дзень ёсць у сем’ях многіх віцяблян – “Витебское подполье”. Арганізацыйную працу па падрыхтоўцы выдання выканаў М.І. Пахомаў. Упершыню кніга пабачыла свет у 1969 г. [12]. Другое, перапрацаванае і дапоўненае выданне з’явілася ў 1974 г. да святкавання Тысячагоддзя Віцебска і 30-годдзя вызвалення горада ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў [13]. Менавіта яно было пакладзена ў аснову выдання 2024 г. [7].

Тэма подзвігу Веры Харужай у акупаваным Віцебску прыцягнула ўвагу даследчыцы яшчэ падчас працы над кандыдацкай дысертацыяй. Незадоўга да гэтага, у 1960 г., Веры Захараўне пасмяротна было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза – вышэйшая ступень адзнакі ў СССР. Не будзе перабольшаннем сказаць, што ў зацікаўленасці Ніны Іванаўны падпольнай дзейнасцю В.З. Харужай прысутнічаў асабісты аспект: даследчыца сама ў гады вайны змагалася за Радзіму і, відавочна, адчувала духоўную еднасць з Верай Захараўнай. Пазней у адным з інтэрв’ю, адказваючы на пытанне, як Вера Захараўна магла пакінуць чатырохмесячнае дзіця і накіравацца ў варожы тыл, Н.І. Дарафеенка сказала: «Да поймите вы, она знала, что ей, опытной подпольщице, нет замены на этом участке. Не было бы самопожертвования,

не было бы и Победы. Личность Хоружей, её характер и отношение к делу меня восхищают» [цыт. па: 11, с. 2].

Першая публікацыя Ніны Іванаўны Дарафеенка, прысвечаная дзейнасці В.З. Харужай у Віцебску ў 1942 г., пабачыла свет яшчэ ў 1967 г. [1]. У адносна невялікім артыкуле на аснове крыніц, якія ўводзіліся ў навуковы ўжытак аўтарам, былі абазначаны ключавыя палажэнні, што вынікалі з праведзенага даследавання (хаця і не ўсе з іх у завершаным выглядзе), а таксама рэканструявана падпольная дзейнасць Веры Захараўны ў Віцебску:

1) група В.З. Харужай з 18 чалавек накіроўвалася з Вялікай зямлі ў акупаваны гітлераўцамі Віцебск, бо было неабходна ўсталяваць сувязь паміж дзясяткамі падпольных партыйных і камсамольскіх арганізацый, "… стварыць адзіны цэнтр, які б каардынаваў работу падпольшчыкаў" [1, с. 2];

2) з групы В.З. Харужай першапачаткова трапілі ў Віцебск Дуся Суранава і Тоня Ермаковіч, пасля чаго Тоня, якая пачынае выконваць ролю сувязной, 1 кастрычніка прывяла ў горад і Веру Харужую (дзейнічала пад сімвалічным псеўданімам Ганна Сяргееўна Карнілава, які ўключаў імёны пакінутых у тыле маленькіх дачкі і сына, а таксама прозвішча мужа-партызана, загінуўшага ў баях з гітлераўцамі). Дуся і Вера спыніліся ў сям'і Вараб'ёвых і распачалі дзейнасць па праверцы 118 адрасоў, атрыманых ад адказнага арганізатара абкама КП(б)Б па Віцебску В. Кудзінава [1, с. 2];

3) адразу ж стала відавочнай ненадзейнасць дакументаў і неабходнасць карэктываў загадзя распрацаванага плана, але Вера Захараўна не здалася і ва ўмовах штодзённых аблаў з ненадзейным пашпартам працягвала сваю дзейнасць па ўстанаўленні сувязяў з патрыётамі (А. Волат, М. Мацэнка, М. Гульбе, М. Оскер, З. Шаракова, А. Ліпці і С. Сюдаболь) [1, с. 3–4];

4) як сведчаць лісты В.З. Харужай з Віцебска, гэта праца была эфектыўнай, бо дазволіла савецкаму камандаванню атрымліваць карысныя разведдадзеныя, у прыватнасці, пра перамяшчэнне нямецкіх вайсковых часцей і аэрадром [1, с. 3];

5) 13 лістапада Вера Харужая, Еўдакія Суранава, сям'я Вараб'ёвых (Марыя Вараб'ёва ("бабуля Маша"), яе сын Васіль з жонкай Агаф'яй і Ганна Васільева, другая нявестка Марыі Ігнатаўны), а таксама партызанская сувязная Клаўдзія Балдачова і Соф'я Панкова (паплечніца Веры яшчэ па Заходняй Беларусі, удзельніца маскоўскай групы), якія ў гэты дзень прыйшлі да Вараб'ёвых, былі арыштаваны паліцыяй. Першапачаткова іх змясцілі ў гарадской турме па Суражскай шашы, але праз пяць дзён перавялі ў турму СД на Успенскай горцы, дзе пасля першага допыту Веру Харужую, Дусю Суранаву і Соф'ю Панкову ізалявалі ад астатніх [1, с. 4];

6) сведкам апошніх дзён жыцця В.З. Харужай стала Ганна Кіташова, якая цудам выжыла у засценках СД; 4 снежня 1942 г. Вера Захараўна разам з палечнікамі і многімі іншымі вязнямі была расстраляна гітлераўцамі [1, с. 4].

Артыкул паслужыў асновай раздела "Вера Хоружая в Витебске" кнігі "Витебское подполье". Тэкст быў пашыраны. Тут названа больш імёнаў савецкіх патрыётаў, якія дапамагалі Веры Захараўне, паказана, якім чынам вялася падрыхтоўка маскоўскай групы да падпольнай барацьбы, скарыстана паняцце "витебская подпольная группа Хоружей" [12, с. 96] у дачыненні да патрыётаў, якіх Вера Захараўна згуртавала вакол сябе. Да гэтага паняцця Н.І. Дарафеенка вернецца ў апошняй публікацыі. У кнізе была акцэнтавана мэта пасылкі В.З. Харужай у Віцебск, у якім дзейнічала ўжо 56 падпольных груп. "Эта огромная армия патриотов наносила весьма ощутимые удары по врагу. Но для того, чтобы их действия были еще более эффективными, нужно было усилить руководство подпольем в городе. Посылка в витебское подполье опытной и закаленной революционерки-подпольщицы Веры Захаровны Хоружей и была попыткой создать руководящий центр в городе" [12, с. 91–92].

Аўтарамі адзначалася, што пасля арышту падпольшчыкаў ніхто не сказаў гітлераўцам ні слова, акрамя Ганны Васільевай, другой нявесткі "бабулі Машы", якая на вочнай стаўцы назвала не псеўданім Веры Харужай, а яе сапраўднае імя.

Менавіта ў кнізе "Витебское подполье" ўпершыню была абгрунтавана гіпотэза аб месцы смерці В.З. Харужай: "Известно также, что большинство подпольщиков, потерпевших провал в декабре 1942 года, а также в январе – марте 1943 года, было расстреляно на территории бывшего 5-го железнодорожного полка. Именно там, среди десятков тысяч жертв фашизма, покоится прах В.З. Хоружей и ее боевых подруг. Они погибли, как солдаты в бою" [12, с. 103–104].

Да абставін подзвігу В.З. Харужай Ніна Іванаўна звярнулася ўжо ў новых гістарычных умовах у 1990–2000-я гг. Штуршком, відавочна, паслужыла падрыхтоўка кнігі "Памяць: Віцебск", пра што пісала сама Ніна Іванаўна ў грунтоўным артыкуле ў газеце "Віцебскі рабочы", адзначаючы ў сувязі з гэтым у "нейкай ступені пошукавы" характар матэрыялу. Тут даследчыца падкрэсліла, што не ўсе сувязі В.З. Харужай у віцебскім падполлі ўдалося раскрыць, у тым ліку таму, што яе пісьмы друкаваліся з купюрамі, прычым "… кожны, хто рыхтаваў тую або іншую публікацыю, скарочваў пісьмы па сваёй прыхамаці" [6, 6 ліп., с. 3].

Значную ўвагу надала Ніна Іванаўна раскрыццю праблемы матэрыяльнага забеспячэння падпольнай дзейнасці В.З. Харужай. Гісторык паказала: грошы і каштоўнасці, якія прызначаліся для групы Веры Захараўны, да яе не дайшлі; у Еўдакіі Суранавай і Веры Харужай не было дакументаў, якія б далі магчымасць легалізавацца ў Віцебску і ўладкавацца на працу, што дазволіла б атрымаць прадуктовыя карткі; у выніку патрыёткі апынуліся ў горадзе без аніякіх фінансавых сродкаў, што вельмі ўскладняла іх дзейнасць, часам амаль галадалі. Сталася так галоўным чынам па віне першага сакратара падпольнага абкама КП(б)Б І.А. Стулава [6, 6 ліп., с. 3]. А сакратар ЦК КП(б)Б Г.Б. Эйдзінаў чамусьці не звяртаў увагі на крык душы Веры Захараўны пра адсутнасць грошай, які прарываўся ў яе пісьмах, хаця і імкнуўся вырашыць праблему з адсутнасцю дакументаў [6, 8 ліп., с. 5]. Яшчэ адной праблемай было тое, што перад адпраўкай групы В.З. Харужай з Масквы ў яе забралі падрыхтаваную радыстку [6, 8 ліп., с. 5].

Н.І. Дарафеенка атрымала магчымасць сказаць і пра рознагалоссі, што існавалі паміж Верай Захараўнай і Сямёнам Васільевічам Юрыным ("Васільевым"), кіраўніком аператыўна-чэкісцкай групы, які рыхтаваў дакументы і "легенду" для засылкі маскоўскай групы Харужай у Віцебск [6, 8 ліп., с. 5]. З-за таго, што Юрын падазраваў усіх і кожнага, цярпелі падпольшчыкі, у прыватнасці, кіраўнік групы медработнікаў Ксенія Сяргееўна Акаловіч, якая адчула пагрозу правалу, выратавалася ад нацыстаў і дабралася да партызан. Але яе паказанні Юрын не ўзяў на веру, нягледзячы на пазітыўную характарыстыку Ксеніі Сяргееўны ў пісьме В.З. Харужай. У выніку падпольшчыца атрымала 10 гадоў турмы і вымушана была пасля зусім хворая жыць у сястры ў Ленінградзе, хаваючыся пад ложкам, бо ёй было забаронена пражыванне ў буйных гарадах [6, 8 ліп., с. 5].

У дадзенай публікацыі Ніна Іванаўна зноў вымушана была са спасылкамі на крыніцы абгрунтаваць мэту накіравання В.З. Харужай у Віцебск: стварэнне падпольнага партыйнага цэнтра. У доказ свайго меркавання аўтар не толькі прывяла цытату з архіўнага дакумента, якая сведчыць пра мэту накіравання Харужай у Віцебск: "Включить в состав подпольного партийного центра в Витебске", які насамрэч неабходна было стварыць), але і спаслалася на гутарку з Р.Б. Эйдзінавым, які сказаў, што В.З. Харужая – "революционерка высшего класса" – была накіравана ў Віцебск як "эмиссар ЦК с очень широкими полномочиями" [6, 13 ліп., с. 3].

Аўтар робіць выснову, што мэта Верай Захараўнай была дасягнута: “Як бачым, за вельмі кароткі час, у найскладанейшых умовах Харужая змагла зрабіць у Віцебску многае. Яна стварыла тут кіруючы цэнтр, дзеля якога пасылалася. Ён дзейнічаў з 27 верасня да 13 лістапада 1942 г. Амаль з усіх канцоў горада, з важнейшых яго аб’ектаў паступала да Харужай інфармацыя: з чыгункі – ад групы “Радзіма” і брата Мацэнка, аб аэрадроме – ад Шараковай, Оскер, ваеннапалонных, цэнтр горада быў у полі зроку групы Ліпці. <…> Аб тым, што партыйны кіруючы цэнтр працаваў эфектыўна, сведчыць ацэнка Эйдзінава. У гутарцы з аўтарамі кнігі «Витебское подполье» ён сказаў так: «Для действий фронтовой авиации она (*г.зн. Вера. – Аўт.*) дала больше, чем дано за многое время до нее. Ее информация поступала сразу же в штаб армии, штаб фронта, в ЦК…». Мы лічым, што кіруючай часткай цэнтра, яго асновай (з кім раілася Вера) з’яўляліся: В.З. Харужая, Е.С. Суранава, В.С. Вараб’ёў, М.І. Гульбе” [6, 15 ліп., с. 5]. Вялікую ўвагу ў артыкуле аўтар надала лёсу маскоўскай групы Харужай і яе ўдзельніц [6, 15 ліп., с. 5].

У 1995 годзе выйшаў зборнік навукова-практычнай канферэнцыі “Вайна вядомая і невядомая”, якая была прысвечана 50-годдзю вызвалення Віцебска ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і адбылася ў чэрвені 1994 г. Паколькі прадстаўнікі айчыннай гістарыяграфіі працягвалі лічыць, што В.З. Харужая была кіраўніком адной з падпольных груп у Віцебску, Ніна Іванаўна зрабіла прадметам свайго даклада і, адпаведна, публікацыі ў зборніку спробы арганізацыі падпольнага партыйнага цэнтра ў Віцебску [4]. Накіраванне ў горад В.З. Харужай стала ўжо трэцяй такой спробай [4, с. 83] і першай эфектыўнай, хаця і кароткатэрміновай.

Важкім доказам у сістэме аргументацыі Н.І. Дарафеенка стаў сам характар дзейнасці Веры Захараўны ў горадзе, які адлюстроўваў атрыманае ёю заданне: “Нашы пошукі і знаходкі даюць права сказаць, што Вера стварыла не групу, а ўстанавіла сувязь з многімі падпольнымі групамі і падпольшчыкамі-адзіночкамі, прыцягнула да работы новых людзей. Яна накіроўвала дзейнасць падполля, давала заданні, вучыла канспірацыі. … Яе сустрэчы з падпольшчыкамі насілі характар інструктажа, парад, перасцярог, давалі зарад духоўных сіл” [4, с. 87].

Н.І. Дарафеенка, палемізуючы з аўтарамі, якія сцвярджалі, што В.З. Харужая ўзначальвала ў Віцебску падпольную групу, падкрэслівала: “Назва ж “група Харужай” адносіцца да той групы з 18 жанчын, якія выехалі з Верай з Масквы і прыбылі ў Віцебскі абкам партыі. У Віцебску пабывалі толькі Суранава, Ермаковіч, Панкова і Іванькова. Апошняя пасылалася, каб высветліць абставіны правалу Веры. Астатнія члены яе групы дачынення да дзейнасці Веры ў Віцебску не мелі, а чацвёра з іх нават не трапілі ў тыл ворага” [4, с. 87].

У высновах аўтар падкрэсліла мужнасць Веры Захараўны і яе паплечнікаў, якія падчас допытаў і катаванняў нікога не выдалі. Падпольныя групы і змагары, звязаныя з Харужай, працягнулі барацьбу.

Менавіта разгледжаны вышэй тэкст з пэўнымі змяненнямі і дапаўненнямі быў пакладзены ў аснову артыкула аб подзвігу Веры Харужай у кнізе “Памяць”. Відавочна, Ніна Іванаўна палічыла больш важнай справай зрабіць акцэнт не на цяжкасцях, насуперак якім дзейнічала Вера Захараўна ў акупаваным горадзе і якія сталі прычынамі яе правалу, а на масштабах і значэнні зробленай ёю работы [5]. Такі ж падыход уласцівы і для двух наступных артыкулаў па праблеме [3; 2].

Апошні з іх быў падрыхтаваны пры нашым удзеле. У навуковы ўжытак была ўведзена копія схемы В.Р. Кудзінава, у гады вайны – адказнага арганізатара абкама партыі па г. Віцебску, якая адлюстравала сувязі В.З. Харужай у Віцебскім падполлі і была перададзена Ніне Іванаўне складальнікам у 1960-я гг. З апорай на гэту крыніцу

Н.І. Дарафеенка палічыла неабходным яшчэ раз расставіць акцэнты ў пытанні аб укладзе В.З. Харужай у падпольную барацьбу з ворагам [2].

Такім чынам, Ніна Іванаўна Дарафеенка, якая прысвяціла жыццё раскрыццю гістарычнай праўды пра дзейнасць патрыятычнага падполля ў Віцебску, унесла значны ўклад у даследаванне ролі ў барацьбе з ворагам Веры Захараўны Харужай. На падставе шырокага кола крыніц (архіўныя дакументы, пісьмы В.З. Харужай з акупаванага горада, успаміны ўдзельнікаў падзей, схема сувязей Харужай у падполлі, складзеная В.Р. Кудзінавым) даследчыца пераканаўча даказала: Вера Харужая была накіравана ў Віцебск для стварэння кіруючага падпольнага цэнтра і, нягледзячы на надзвычай складаныя, небяспечныя ўмовы дзейнасці, справілася з заданнем. За паўтара месяца патрыётка паспела зрабіць шмат. Усталяванне сувязяў з многімі падпольнымі групамі і асобнымі патрыётамі дазволіла ёй акумуляваць і перадаваць у Цэнтр вельмі карысную інфармацыю. Нягледзячы на жорсткія катаванні, Вера Захараўна і яе паплечнікі нікога не выдалі, загінулі, але маральна перамаглі гітлераўскіх катаў.

Спадзяемся, што вынікі грунтоўных даследаванняў подзвігу В.З. Харужай, атрыманыя Н.І. Дарафеенка, урэшце знойдуць адлюстраванне ў вучэбнай літаратуры, публіцыстыцы і навуковай біяграфіі Веры Захараўны, якая мае быць створана.

1. Дарафеенка Н.І. Апошняя старонка [Пра апошнія месяцы жыцця і барацьбы В. Харужай] / Н.І. Дарафеенка // Літаратура і мастацтва. – 1967. – 1 снеж. – С. 2–3, 4.

2. Дарафеенка, Н. І. У адпаведнасці з праўдай гісторыі: Роля В.З. Харужай у дзейнасці Віцебскага падполля / Н. І. Дарафеенка, А. М. Дулаў // Беларуская думка. – 2011. – № 6. – С. 21–25.

3. Дарафеенка, Н. І. Аб Веры Харужай – новае слова / Н. І. Дарафеенка // Віцебшчына ў 1941–1944 гг.: Супраціў. Вызваленне. Памяць : матэрыялы рэсп. навук.-практ. канф., Віцебск, 18–19 чэрвеня 2009 г. / Віц. дзярж. ун-т ; рэдкал.: В.У. Акуневіч (адк. рэд.) [і інш.]. – Віцебск : УА “ВДУ імя П.М. Машэрава”. – С. 110–117.

4. Дарафеенка, Н. І. Аб кіруючым падпольным цэнтры ў Віцебску (1941–1943). Новы погляд на абставіны падпольнай дзейнасці В.З. Харужай / Н. І. Дарафеенка // Война известная и неизвестная : материалы науч.-практ. конф., посвящ. 50-летию освобождения Витебщины от немецко-фашистских захватчиков, 15–16 июня 1994 г. – Витебск : Витебский областной краеведческий музей, 1995. – С. 80–88.

5. Дарафеенка, Н. І. Подзвіг Веры Харужай у Віцебску / Н. І. Дарафеенка // Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Віцебска: у 2 кн. / рэд. кал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) і інш. – Мінск : БелЭн, 2002. – Кн. 1. – С. 471–478.

6. Дарафеенка, Н.І. Ды не прыстала нідзе ты, не збочыла ... [Пра падпольную дзейнасць В. Харужай у Віцебску] / Н.І. Дарафеенка // Віцебскі рабочы. – 1993. – 6 ліпеня. – С. 3; 8 ліпеня. – С. 5; 13 ліпеня. – С. 3; 15 ліпеня. – С. 5; 20 ліпеня. – С. 3.

7. Дорофеенко, Н. И. Витебское подполье / Н. И. Дорофеенко, Н. В. Дорофеенко, Н. И. Пахомов; сост. А. Н. Дулов [и др.] ; авт. предисл. А. Н. Дулов. – Минск : Звязда, 2024. – 256, [32] с. : ил.

8. Дулаў, А. М. Гісторыя віцебскага падполля ў працах Н.І. Дарафеенка / А. М. Дулаў // Вклад белорусского народа в Великую Победу : материалы респ. науч.-практ. конф., Минск, 27 ноября 2009 г. / ред. кол.: Е. А. Гребень (отв. ред.) [и др.] – Минск : БГАТУ, 2010. – С. 88–95.

9. Дулаў, А. М. Н.І. Дарафеенка – удзельніца руху супраціўлення і даследчыца Віцебскага падполля / А. М. Дулаў // Віцебшчына ў 1941–1944 гг.: Супраціў. Вызваленне. Памяць : матэрыялы рэсп. навук.-практ. канф., Віцебск, 18–19 чэрвеня 2009 г. / Віц. дзярж. ун-т; рэдкал.: В. У. Акуневіч (адк. рэд.) [і інш.]. – Віцебск : УА “ВДУ імя П.М. Машэрава”. – С. 117–128.

10. Дулаў, А. М. Патрыётка, даследчыца, педагог: памяці Ніны Іванаўны Дарафеенка / А. М. Дулаў // Наука – образованию, производству, экономике : материалы XXI(68) Регион. науч.-практ. конференции преподавателей, науч. сотрудников и аспирантов, Витебск, 11–12 февраля 2016 г. : в 2 т. – Витебск : ВГУ имени П.М. Машерова, 2016. – Т. 1. – С. 272–275.

11. Крупица, Н. «... Были люди, у которых были лица...» / Н. Крупица // Віцьбічы. – 2003. – 17 сент. – С. 2.

12. Пахомов, Н. И. Витебское подполье / Н. И. Пахомов, Н. И. Дорофеенко, Н. В. Дорофеенко. – Минск : Беларусь, 1969. – 240 с.

13. Пахомов, Н. И. Витебское подполье / Н. И. Пахомов, Н. И. Дорофеенко, Н. В. Дорофеенко. – 2-е изд., перераб. и доп. – Минск : Беларусь, 1974. – 248 с.

14. Скапа, У. Вернасць прызванню [М.У. Дарафеенка] / У. Скапа // Віцебскі рабочы – 80 год / Рэдакцыя абласной газеты “Віцебскі рабочы”. – Віцебск, 1997. – С. 141–144.